Дудко В. Д.

# ЗА ТРЫНАЦЦАЦЬ КІЛАМЕТРАЎ ДА ПЕРАМОГІ

Поезд запаволіў бег. "Напэўна, ужо хутка", – вырашыў ён і, не адрываючы позірку ад акна, за якім зрэдку пачалі з'яўляцца адзінокія домікі прыгарада, апрануў кіцель.

Сустрэча... "Зараз будзе станцыя. Там ужо чакаюць. І відаць, хвалююцца не менш за мяне". Узяў у рукі газету, купленую яшчэ ў брэсцкім прывакзальным кіёску, адклаў: словы без усякага сэнсу грувасціліся перад вачамі. Пачаў зноў глядзець у акно. Але і гэта не знімала напружання: поезд прыкметна збаўляў ход, быццам адразаючы мінуту за мінутай, што заставаліся да сустрэчы.

Менавіта цяпер, за няблізкую дарогу ў ГДР, куды яго запрасілі нямецкія сябры, чалавекам раптоўна авалодала вострае пачуццё адзіноты. Дзіўна: яшчэ якую гадзіну назад ён не сумаваў, не давалі ўспаміны. А вось перад самай сустрэчай з людзьмі, якіх ніколі ў жыцці не бачыў, ведаў усяго толькі па перапісцы, пашкадаваў, што няма побач спадарожніка-земляка. З ім можна было б падзяліцца перажываннямі, проста перакінуцца словам – і то паспакайнела б. А яшчэ лепш – расказаць пра першую сустрэчу з Бернау – горадам, дзе яго цяпер чакаюць.

...Амаль чатыры дзесяцігоддзі мінула з тае пары. Стаяў такі ж сонечны веснавы дзень, як гэты. У паветры пахла сырой зямлёй і маладым кволым лісцем. У рэдкім ляску знаходзіўся ў рэзерве іх 1822-і самаходны артылерыйскі полк. Усё ажывала, набіралася сіл, толькі птушкі прыціхлі. А бой грымеў. Зусім недалёка. Маёр Данілюк, стоячы на запыленай вежы танка, глядзеў у бінокль. Быў бачны горад, акружаны таўшчэзнай каменнай сцяной. "Што й казаць – сапраўдная крэпасць гэты Бернау. Стагоддзе недзе дванаццатае-трынаццатае. Пабудаваны яўна для абароны... Не, не разлічвалі відаць, фашысты, што мы прымусім іх выкарыстоўваць гэту даўніну па прызначэнню. Аднак прыйшлося, ды яшчэ як. Толькі вось падабрацца да горада – задача. Ну, нічога і гэты замочак адкрыем, не ўпершыню нам", – разважаў ён.

Бернау абараняла буйная групоўка гітлераўцаў, узмоцненая танкамі, артылерыяй. Яна прыкрывала шлях на Берлін, да якога адсюль было ўсяго трынаццаць кіламетраў. Спроба ўзяць горад з ходу атакуючым часцям не ўдалася: вораг шалёна супраціўляўся. Ды і сцены служылі яму надзейным шчытом.

Чарговая атака. Салдаты, скошаныя свінцом, падаюць і заміраюць у вечнай нерухомасці, гараць танкі. Цяжка пазбавіцца ад адчування

нейкай сваёй віны перад тымі, хто наперадзе, пад сценамі. Вясна, маладосць і побач — смерць, небыццё. Прайшоўшы амаль усю вайну, спазнаўшы, здавалася б, да драбніц яе нечалавечую сутнасць, дваццацішасцігадовы камандзір палка ніяк не мог прывыкнуць да гэтай жудаснай неадпаведнасці ў прыродзе. І ў сорак першым, калі лейтэнантам толькі трапіў на перадавую, і цяпер, у канцы франтавой дарогі, Леанід Данілюк цяжка і горка перажываў гібель людзей, часта ўспамінаў прозвішчы, твары тых, каго ведаў. Сярод іх сустракаліся і ўчарашнія дзесяцікласнікі, яго, па сутнасці, былыя вучні, якім вайна не дала даслухаць апошнія акорды выпускнога балю. Яны жылі яшчэ ўспамінам пра дзяцінства, школу, а ў ім, камандзіру, бачылі свайго настаўніка, класнага кіраўніка, нярэдка нават забываліся і звярталіся, як прывыклі звяртацца да настаўнікаў: "Леанід Сямёнавіч".

Ішлі побач і людзі больш сталых гадоў. Тыя панюхалі ўжо пораху, пакаштавалі салёнага салдацкага поту. Данілюк па ўзросту мог быць ім за сына. Але старэйшыя байцы паміж сабой называлі камандзіра "бацем". Такая завядзёнка існавала ўсюды на фронце.

Наогул маёр лічыў, што на асабовы састаў яму шанцавала. Ці то выпадкова, ці то па волі каго-небудзь "зверху", але да яго прыходзілі добрыя і афіцэры і салдаты. На фронце чалавек, кажуць, як на далоні. Многім Леанід Сямёнавіч давяраў як сабе, быў гатовы выконваць з імі любы загад. Людзі, вядома, мяняліся: навічкі займалі месцы тых, хто не вяртаўся з бою, потым і з імі развітваўся назаўсёды. І так усю вайну: пад Ленінградам і на Украіне, у Беларусі, Польшчы, у Германіі. Колькі ён страціў ужо за гэтыя чатыры гады! І кожная страта адгукалася ў сэрцы шчымлівым вярэдлівым болем. У памяці жыў Віктар Быкаў, таварыш па Тбіліскаму артылерыйскаму вучылішчу, весялун і непаседа. Няма ўжо Віцькі, загінуў. А Васіля Спірыдонава ў Польшчы пахаваў. Быў такі ў яго палку лейтэнант – камандзір самаходнай артылерыйскай установкі. Пра мужнасць яго і цяпер легенды жывуць.

Аднойчы рухаўся полк да Віслы. Злева, кіламетрах у чатырох-пяці, у тым жа напрамку адыходзіла нямецкая танкавая калона. Экіпаж Спірыдонава з-за паломкі крыху адстаў. Даганялі ўжо ноччу. У поўнай цемры ды без карты выскачылі хлопцы на "нямецкую" дарогу, прыстроіліся гітлераўцам у хвост. Тады толькі заўважылі гэта, калі віднець пачало. Але назад не павярнулі: апошнюю машыну падаб'юць, аб'едуць, і зноў бранябойным ззаду. Так адзінаццаць "тыграў" знішчылі. Нездарма Героя далі лейтэнанту.

А колькі іншых баявых сяброў страціў – не ўспомніць усіх камандзіру палка...

Каго на гэты раз выбера смерць – праклятая спадарожніца вайны? Хто знойдзе тут, за трынаццаць кіламетраў да апошняга бою, свой вечны спакой? Данілюк усё трымаў у руках бінокль, пільна ўглядаючыся туды, дзе ўжо дагарала атака. Перад вачамі ляжала знявечанае гусеніцамі, пабітае воспамі варонак веснавое поле. Але бачыў ён чамусьці іншае – асенняе і халоднае, пад Ціхвінам.

...Крыху ўдалечыні ад іх пазіцый шэрым пакатым гарбом выступала з туману вышыня. "Задача вашага ўзвода, лейтэнант, ісці прама на яе, карэкціраваць агонь батарэі. Гэта метраў семсот. Вунь, бачыце дрэўца? Таго напрамку і трымацца. Ясна? А цяпер – усёй роце. Мы павінны скінуць фрыцаў любой цаной, у што б там ні было. Сігнал пачатку атакі – дзве белыя ракеты. Пытанняў няма? Тады па месцах, таварышы афіцэры", – пачуў нібы наяве Данілюк голас свайго першага на фронце камандзіра.

Павісла, расцяклася трапяткім святлом над траншэяй ракета. За ёй – другая...

– У атаку, за мной!

Лейтэнант рыўком ускочыў на бруствер і пабег. Пяцьдзесят метраў, сто. Бліжэй, яшчэ бліжэй. Свішчуць кулі, віскаюць асколкі. Ад выбухаў, нібы перапуджаная кабыла, уздрыгвае ўсім сваім вялікім параненым целам зямля. Побач таксама бягуць. Нехта падае. Метры жыцця... Як хочацца іх прайсці! І як не хочацца, каб сталі яны апошнімі.

Раптам рэзкі гарачы боль сакануў у твар. Апусцела ўсё навокал, перавярнулася. Ен ступіў яшчэ крок-другі і ўпаў, нават не паспеўшы асэнсаваць тое, што адбылося... Над ім ніхто не схіліўся. З амаль дзвюх соцень, якія падняліся ў атаку, на вяршыню дайшлі васемнаццаць.

Гавораць, чалавек, які выратаваў табе жыццё, назаўсёды становіцца родным і блізкім. Радавы Генадзь Забалотнікаў... На вышыні ён заўважыў, што камандзіра сярод васемнаццаці няма, кінуўся шукаць яго. Той ляжаў нерухома каля самага схілу. Прадзіраўленая каска з'ехала набок. Пасечаны асколкам, заліты крывёю твар было не пазнаць. Салдат патузаў за плечы:

– Таварыш лейтэнант!..

Той не азваўся.

– Лейтэнант!..

У адказ – цішыня. Толькі рука намёртва сціскае "ТТ"...

Над полем ужо рассеяўся туман. Цёплыя яшчэ варонкі дыхалі едкім прагорклым дымам, ад якога нясцерпна свярбела ў горле, выварочвала нутро. Забалотнікаў у адчаі апусціўся перад Данілюком на калені, згроб з галавы пілотку. Пастаяўшы так крыху, ён непаслухмянымі пальцамі расшпіліў гузікі камандзіравай гімнасцёркі, палез у кішэню, каб дастаць дакументы, і тут жа адняў руку, быццам абпаліла яе чым. Прыпаў да грудзей вухам: сэрца ледзь білася. Жывы. Жывы!.. Салдат хутка падхапіў абмяклае цела лейтэнанта і асцярожна, каб, крый божа, не зрабіць параненаму горш, панёс да сваіх. Вось так чалавек вярнуў жыццё чалавеку...

Пасля таго выпадку шмат адгрымела баёў. Неаднойчы яшчэ даставалі Данілюка то куля, то асколак.

Вайна бязлітасная. Было раненне, калі ўрачы вынеслі прыгавор: адваяваўся. Сівы падпалкоўнік-медык на камісіі ў далёкім тылавым шпіталі строга адрэзаў: "Усё, малады чалавек, вам ужо ніколі не вярнуцца на фронт. Дзякуйце лёсу, што з рукой засталіся!.."

Апынуўся Данілюк у Свярдлоўску, дзе назначылі яго камандзірам вучэбнага артылерыйскага дывізіёна. Але думкі пра вяртанне да сваіх баявых сяброў не пакідаў. Пісаў рапарты. Чакаў адказу. Адмаўлялі. Зноў браўся за паперу і зноў чакаў. І дабіўся свайго Леанід Сямёнавіч, вярнуўся ў строй. Доўга цёплым словам успамінаў урачоў, якія выратавалі яго ад калецтва, штабістаў, якія пачулі яго просьбы і дазволілі вярнуцца ў строй.

Так, шмат добрых і чулых людзей сустракаў ён на франтавых шляхах-дарогах. Але з найбольшай удзячнасцю Данілюк думаў заўсёды пра Забалотнікава – гэтага каржакаватага, вечна надзьмутага сібірака.

"Забалотнікаў, дарагі чалавек... Каб жа не вярнуўся тады, не адшукаў мяне, застаўся б там назаўсёды..."

Маёр пакурчыўся як ад холаду. Думка пра магчымую ўласную смерць хоць ужо і не вельмі палохала яго, бо нагледзеўся на іншыя, але кожны раз непрыемна халадзіла кроў. Ён не хацеў паміраць. Ён хацеў жыць. Усе тады хацелі вытрываць, дайсці, убачыць Перамогу.

Атака зноў не ўдалася... Парадзелыя роты адыходзяць назад. Данілюк апусціў бінокль, ад злосці прыкусіў губу. "Што рабіць?" Кампалка адчуў раптам, што, калі паглядзець збоку, то ён, відаць, вельмі нагадвае цяпер нявопытнага настаўніка, які ў разгубленасці стаіць перад класам. Крыху раней, мяркуючы, што палку ўсё ж прыйдзецца падключацца да наступлення, ён выслаў наперад разведчыкаў. Але з мінуту назад паступіў загад камандавання спыніць атакі да раніцы. "Чакаць... Выходзіць, што дарэмна адправіў людзей. Нехта з іх, магчыма, не вернецца. Хто будзе вінаваты ў гэтым? Вядома ж – я, ніхто іншы. Куды, навошта спяшаўся?.. На вайне страты непазбежныя, гэта праўда. Але калі так недарэчна, ні за што, па сутнасці, загінуць хлопцы? І ўсё з-за тваёй паспешлівасці, таварыш кампалка..." У думках Данілюк папракаў сябе. Былы настаўнік, педагог, ён і цяпер заставаўся чалавекам, адказным за лёсы тых людзей, якімі кіраваў, для якіх быў ва ўсім першым; разумеў: ніякая вайна не знімае з чалавека абавязку берагчы іншых. Бо вайна – гэта таксама жыццё, хоць любоў і нянавісць, дабро і зло, вернасць і здрада жывуць у больш вострых формах.

Як збавення, чакаў Данілюк новага загаду. Ведаў, што наўрад ці будзе, і ўсё ж чакаў. Час ішоў – разведчыкі не вярталіся...

З такімі вось даўно яму знаёмымі пачуццямі сваёй вінаватасці маёр саскочыў на зямлю, агледзеўся. Артылерысты, яшчэ мінуту назад гатовыя да бою, адчынялі люкі самаходак і таксама вылазілі з машын. Хто масціўся прылегчы ў халадку прама каля тракаў, хто кідаўся на сырую яшчэ зямлю, пад дрэвы. Салдаты даставалі з камбінезонаў зашмальцаваныя кісеты, распачыналі знаёмую ў час перакураў гаворку.

Леанід Сямёнавіч звычайна быў сярод байцоў. Але вельмі захацелася ад усяго адпачыць. Ён выбраў непадалёку немаладую,

ссечаную ўверсе сасну ("відаць, снарадам зрэзала бедную..."), прысеў, прыхінуўшыся спіною да яе шурпатага ствала.

– З'явіцца разведка, адразу ж да мяне, – загадаў Яжову, свайму ад'ютанту.

Апошнім часам яму рэдка шанцавала на спакой, адпачынак. Томік Лермантава, які насіў у сваёй камандзірскай сумцы недзе ўжо трэці месяц, каторы тыдзень так і заставаўся прачытаным толькі да сёмай старонкі.

Маршы – баі, баі – зноў маршы. Кожны раз, калі, здавалася, стома вось-вось зваліць з ног, ён падбадзёрваў сябе думкамі, што неўзабаве ўсяму гэтаму будзе канец, ён і выспіцца, і начытаецца ўволю. Аднак, чым бліжэй быў гэты самы канец вайны, тым мацней адчувалася стомленасць. Яна нібы назола тая жыла ў ім, падпільноўвала выпадак, калі ў віры яго франтавых будняў здаралася якое зацішша.

Паблізу ціха гутарылі. Ён прыслухоўваўся да размовы, спадзеючыся такім чынам адагнаць сон.

– І чаму гэта нас не кінулі ў наступленне?

– Болей пажывеш, дзівак... Або ты памерці спяшаешся?

– А, усё адно ніхто не чакае, няма каму. У сорак другім вёску нашу спалілі. З людзьмі разам. І мае там...

– Адкуль жа сам будзеш?

– З-пад Капыля я.

– А дзе гэта?

– Дык у Беларусі, братка. Няўжо не ведаеш?

– Та-ак...

"Беларус... Зямляк, значыць. Цікава, колькі гэта ад нашай Быхаўшчыны да Капыля? Пэўна, не так і многа... А не ведаю ж. Сорам... Настаўнікам быў, дзяцей разумнаму, добраму, вечнаму вучыў, а гэтага не ведаю..."

Памаўчалі. Байцы нетаропка пасмоктвалі самакруткі. У паветры пахла махорачным дымам. Кожны, відаць, думаў пра нешта сваё, патаемнае, да болю шчымлівае. На фронце заўсёды ёсць пра што памаўчаць. І думкі Данілюка адышлі, аддаліліся ад вайны, патанулі ў недалёкім яшчэ мінулым. Яно, здавалася, адбілася ў памяці нават на першы погляд самай нязначнай, не вартай увагі дробяззю. Бо было дарагім і патрэбным цяпер. Чалавек увогуле на вайне ўчэпіста трымаецца за сваё мінулае, таму што цяперашняе на ёй – катэгорыя адносная і вельмі хісткая: у гэту мінуту ты жывеш, а ў наступную... Мінулае ж – іншая справа: шчасце ў ім і гора, радасць і смутак – жыццё! Так, жыццё. Мінулае на фронце мае куды вышэйшую цану, чым тады, калі называлася яно цяперашнім. У ім знаходзілі паратунак ад душэўных і фізічных пакут, туды вярталіся ў думках, каб падмацаваць пачуцці, набрацца сіл для любві і нянавісці, мужнасці і стойкасці. Вайна многае магла забіць у гэтым мінулым, як у таго салдата з-пад Капыля, але ніколі – выкрасліць з памяці.

У кожнага яно было сваім і па-свойму балючым. Данілюку ў гэтым сэнсе пашанцавала. Ён быў спакойны за родных. Ведаў, што бацька і маці жывыя, што Валя, яго жонка, разам з сынам Эдзікам знаходзіліся цяпер у вызваленым Харкаве. Апошнім часам весткі ад іх ён атрымліваў рэгулярна. Валя пісала пра цяжкасці, з якімі сутыкнуліся людзі пасля акупацыі, пра аднаўленне ў горадзе, пра іх з сынам жыццё. Бацькі пра сваё паведамлялі. З радасцю прачытваў ён цёплыя, душэўныя пісьмы, заўсёды спачуваючы тым салдатам і афіцэрам палка, у якіх не засталося каму пісаць.

Мінулае не забываецца. Нярэдка.ў час далёкіх маршаў Данілюк успамінаў то лес каля роднай вёскі Студзёнкі, сіні край якога быў бачны з акон іх старэнькай школы, то бацькоўскі дом, дзе ў кутах стаялі поўныя кніг этажэркі. Сямён Васільевіч і Вольга Рыгораўна Данілюкі настаўнічалі, таму кніжак у доме мелася багата. Скончыўшы Магілёўскі педінстытут, пачаў і ён вучыць дзяцей. Успамінаў першыя свае ўрокі мовы і літаратуры, як прывіваў вучням-аднавяскоўцам любоў да Пушкіна, Гогаля. Можа, так і застаўся б у школе, але ў свеце запахла порахам, і Леанід перад самай вайной паступае ў артылерыйскае вучылішча. А там і фронт. Першы бой для яго – маладога, неабстрэлянага лейтэнанта, – здаўся вечнасцю.

...З мінулага вярнуў дружны рогат байцоў. Маёр ажывіўся.

– Мы ўсе павылазілі, а Ягорава ўсё няма. І раптам ён – куляй з саломы. "Немцы тут, немцы", – крычыць. Вочы ў самога што яблыкі, чэснае слова...

"Ну вось, зноў Яжоў свайго коніка асядлаў, – пазнаў Данілюк голас ад'ютанта, усміхнуўся. – Сур'ёзны быццам бы хлопец, а іншы раз завядзецца, што той жартаўнік з апошняй парты: хлебам не кармі, а дай пасмяяцца". Камандзір быў сведкам гэтай і на самай справе вясёлай гісторыі. Яжоў не хлусіў. Здарылася яна яшчэ на Украіне, пад Александрыяй. Ехалі яны на "вілісе" праз невялікую вёсачку, а тут звяно "месераў" – з-за хмар вынырнула і давай лупіць. Машыну кінулі, а самі хто-куды. Данілюк у хату ўскочыў, Яжоў схаваўся на двары ў пограбе, а Ягораў у хляве ў салому зашыўся. Калі фрыцы назад павярнулі...

– ...Думаем, а раптам і сапраўды застаўся які, не паспеў драпануць, – працягваў Яжоў. – Мы, натуральная справа, аўтаматы наставілі, "баця" сваю "пушку" з кабуры выцягнуў. "Хэндэ хох, – гаворым, – вылазь!" Фашыст маўчыць, не адгукаецца. "Можа, хлусіш ты, Васіль, ніякага фрыца там няма?" – пытаемся. Божыцца: "Ды я ж чуў, як ён побач варушыўся. Сам бачыў. Трэба віламі пхнуць, таварыш маёр". "Бацяˮ кажа: "Ану, давай!" І мы – за вілы. Р-р-раз з аднаго боку – ні гу-гу. Р-р-раз з другога – цішыня, не выдае сябе фашыст паганы. І тут з трэцяга разу ш-шух у салому. А браткі ж мае! Адтуль як завішчыць, як заенчыць – мы ажно папрысядалі, не можам нічога ўцяміць. Раптам ззаду голас бабы: "Оцэ вояки! Від німців кільки часу порося ховала – нэ знайшли. А ви так відразу..." У нас і сківіцы адвіслі.

– Лаялася? – ледзь не давяцца ад смеху салдаты.

– Няўжо ж хваліла? Але парася цэлае засталося, нічога, крыху хіба што зачапіла. Вось тут і павесялела гаспадыня. Добрая такая баба была, ветлівая. Нагаравалася, відаць, за вайну. А мы далей паехалі...

Наўкола зноў стала ціха. Маёр загледзеўся на мураўёў, што мітусліва бегалі па яго стаптаных, у плямах чырвонай гліны ботах, і нечакана для сябе заснуў.

Ненадоўга.

– Таварыш маёр, разведчыкі прыйшлі.

Перад ім стаяў Яжоў. Твар яго быў сур'ёзны, ад нядаўніх жартаў і следу не засталося. Маёр хутка падняўся, паправіў камбінезон.

– Дзе яны?

– Каля вашага танка чакаюць.

Данілюк узрадаваўся, як хлапчук, убачыўшы ўсіх жывымі. Было жаданне кожнага абняць, расцалаваць. Але, нічым не выказаўшы радасці, бо не любіў ніколі выстаўляць свае эмоцыі, адразу ж загадаў:

– Дакладвайце!

– У сцяне ёсць пралом, таварыш маёр. Невялікі, праўда, але танкі і самаходкі павінны прайсці.

– Павінны? – маёр нядобра зірнуў на старшага групы. Ён ад вучняў сваіх заўсёды патрабаваў дакладнасці ў адказах. Але то было ў школе. І слова ля дошкі ніяк не вырашала лёс чалавека. А тут – вайна, і такая вось няўпэўненасць аднаго можа іншы раз каштаваць жыццяў многім.

– Пройдуць!

– Цяпер іншая справа, – ужо мякчэй сказаў Данілюк, дастаў карту. – Пакажыце, дзе гэта.

– Вось тут.

– Добра, адпачывайце пакуль. Яжоў, Шапашнікава і Масляева – да мяне!

Ен задумаўся. "Гэта – шанц. Такую магчымасць грэх не выкарыстаць. Можна прарвацца ў пралом – і Бернау – наш, шлях корпусу адкрыты. Будуць, вядома, страты. Але калі заўтра зноў атакаваць у лоб, людзей загіне куды болей. Чакаць раніцы... А што тады? За ноч жа сцены не знікнуць. Рызыка? Так, аднак хіба бывае без яе? Што ж рабіць?.. Ісці ў пралом трэба. Памыліцца разведчыкі не маглі. А раптам ды не атрымаецца? Да таго ж як расцэніць нашу ініцыятыву начальства? Зараз абмяркуем... І ўсё ж трэба паспрабаваць, трэба..."

Камандзір палка мог прыняць самастойнае рашэнне. Ен меў на гэта права. Але ў характары прыроджанага педагога жыла патрэба заўсёды, калі справа датычыла не толькі яго аднаго, раіцца з іншымі. На фронце гэта рыса яшчэ больш загартавалася. Данілюк, ведаючы пра сваю гарачнасць, якая, дарэчы, самому яму не раз ледзьве не каштавала жыцця, не хацеў рызыкаваць людзьмі. Асабліва цяпер, калі да Берліна – а значыць, і да канца вайны, да перамогі, – заставалася ўсяго трынаццаць кіламетраў. На вышыні пад Ціхвінам да цэлі было семсот метраў. І яны для многіх яго аднапалчан сталі апошнімі. Але то

быў сорак першы год, самы пачатак вайны. А тут – трынаццаць кіламетраў. Трынаццаць... Чортаў тузін. Ды гэта крэпасць яшчэ. Прасцей было б дачакацца раніцы...

Хутка начальнік штаба палка Шапашнікаў і намеснік па палітчастцы Масляеў былі ў яго. Узважыўшы ўсе "за" і "супраць", вырашылі: равамі падыходзім як мага бліжэй да пралому і, не расцягваючыся па фронту, аіакуем. Прыданая палку артылерыя вядзе агонь у напрамку горада з мэтай заглушыць гук рухавікоў.

Данілюк заняў сваё месца ў танку і неадкладна звязаўся па рацыі з камандзірам корпуса, далажыў пра сваё рашэнне.

– Ты што, маёр, звар'яцеў? – прарваўся ў навушнікі глухі, бязлітасны голас, у якім гучалі і стомленасць, і раздражненасць генерала. – Ніякіх атак. Адставіць!..

– Дык там жа пралом ёсць, таварыш генерал. Гэта ж верны шанц узяць горад, – не сунімаўся кампалка, разлічваючы ўсё ж на згоду начальства.

Рацыя замаўчала.

– Альшэўскі, што з сувяззю? – злуючыся, што вельмі неабходная яму размова магла так недарэчы абарвацца, спытаў радыста.

– У парадку, таварыш маёр...

Па тым, з якой упэўненасцю адказаў Альшэўскі, ён зразумеў, што сувязь сапраўды працуе. "Чаму ж тады камкор замаўчаў? Раіцца з кім, ці што?.."

Камандаванне корпуса давярала Данілюку, нярэдка ў складаных сітуацыях разлічвала на яго. Полк увайшоў у Германію з ганаровай назвай "Брэсцкі", трыма баявымі ордэнамі на сцягу. Ды і сам камандзір меў ужо ордэны Айчыннай вайны дзвюх ступеней, тры ордэны Чырвонага Сцяга, медалі. Хадзіў, значыць, не ў баязліўцах. І як вышэйшая ўзнагарода – у 1942 годзе яго прынялі ў партыю. Здавалася, ні ў ім, ні ў людзях палка сумненняў быць не павінна.

Прайшлі секунды. Раптам зноў піснула ў навушніках, і ён пачуў:

– Ну, Данілюк, сарві-галава, давай! Будзе цяжка – падтрымаем. Поспеху, маёр...

"Уперад!" Танк крануўся з месца і, страляючы чорнымі клубамі дыму, павольна папоўз з узгорка. За ім рушылі астатнія. Адразу з тылу ўдарыла артылерыя...

Праз нейкі час наперадзе з'явілася сцяна. Данілюк шчыльней прыпаў да трыплексаў.

"Дзе ж пралом? Ага, вось ён, крыху злева. Так-так... Гарматы паставілі. Прадбачылі, напэўна, што паспрабуем сюды праскочыць. Колькі ж іх? Адна. Другая вунь. І трэцяя..." Гэта акалічнасць нядобра ўстрывожыла. Маёр аж скалануўся ад думкі, што нават адна варожая гармата, адзін які-небудзь яе няшчасны выстрал можа ўмомант спляжыць усе планы, што немцы змогуць спыніць, а затым у тры ствалы расстраляюць добрую частку самаходак, што ішлі за яго камандзірскім танкам. "Ім бы толькі першую машыну падпаліць, і

абавязкова каля ўвахода ў пралом. Тады яе не абыдзеш, і вынік усёй атакі – нуль з мінусам. Заўважылі яны нас ці не? Не, мабыць, пакуль спакойна..."

А першым жа ішоў ён – маёр Леанід Сямёнавіч Данілюк. Цяпер ад яго, ад механіка-вадзіцеля Васіля Ягорава, радыста-кулямётчыка Ігара Альшэўскага, зараджаючага Паўла Сікорскага – усяго экіпажа камандзірскай "трыццацьчацвёркі" з белай лічбай "220" на вежы залежала ўсё ў гэтай аперацыі. Мінуюць пралом яны – пройдуць і астатнія. Але не так лёгка гэта зрабіць.

Немцы ля гармат замітусіліся. "Заўважылі", – падумаў Данілюк.

– Накрылі нас, таварыш маёр...

– Бачу я, бачу... Давай Васіль, на поўны ход.

Пралом набліжаўся, здавалася, з неймавернай хуткасцю. Усё большым станавілася чорнае вока першай варожай гарматы.

– Павел, асколачным...

– Есць!

– Агонь!

Там, дзе стаяла гармата, узняўшы ўверх зямлю, вырас чырвона-чорны слуп. Пралом яшчэ бліжэй. Вецер адагнаў дым і пыл. З шэрай масы сцяны зрок ужо выхоплівае асобныя камяні. Другая гармата. Ствол глядзіць прама ў вежу, і немцы не мітусяцца побач. "Паспелі, зарадзілі ўжо", – сцебанула прыкрая думка. Кроў ударыла ў скроні. "Усё, канец..."

– Аскол...

Апошніх слоў сваёй каманды маёр не пачуў. Страшэнная сіла ўдарыла ў танк, спыніўшы яго, як цацку. Гарачай хваляй абпаліла твар, рукі, болем ірванула па назе. "Падбілі... Хаця б не ў праломе, не ля ўвахода... Моцна баліць нага. Жывы, значыць..." Танк у наступны момант уздрыгнуў і, нібы пераадольваючы тую сілу, якая толькі што прымусіла яго спыніцца, цяжка папоўз уперад. У вушах гуло, дым рэзаў вочы, але маёр працягваў бой. Нібы праз туман ён бачыў, як у трыплексах зноў пагойдвалася сцяна. Вось-вось яны ўціснуцца ў чорную пашчу пралому. Але там яшчэ адна гармата. Зусім блізка, лічаныя метры да яе. "Хутчэй, хутчэй жа. Чаму не страляеш, Сікорскі?"

– Агонь! Паўлуша, агонь!..

Данілюк, не пачуўшы прывычнага "ёсць!", адразу ўсё зразумеў: снарад прашыў іх наскрозь, Сікорскага або цяжка параніла, або... Ён ведаў гэта напэўна, бо сам пяць разоў гарэў у танку. І яшчэ ён ведаў: нешта нядобрае павінна было адбыцца і з Ігарам, бо яго месца на адным баку машыны з месцам зараджаючага.

Цемрадзь пралому шчыльным покрывам лягла на трыплексы. "Трыццацьчацвёрка" з бязлітасным скрыгатам падмяла тракамі гармату і на ўсім ходу выскачыла на вузкую вулічку горада. Шлях быў свабодны. Следам за танкам камандзіра прайшлі самаходкі палка, рассыпаючыся на выхадзе якая прама, якая ўбок. "220"-ы, калі яго абышлі, спыніўся. Данілюк агледзеўся навокал – быццам нікога.

Адкрыў люк, высунуў галаву. Ціха. Ен асцярожна, каб не зачапіць чаго параненай нагой, падняўся, набраў поўныя грудзі чыстага веснавога паветра і гучна выдыхнуў. "Усё. Прайшлі". Ужо недзе ў цэнтральных кварталах горада чуліся выбухі, аўтаматныя чэргі, адзіночныя стрэлы.

– Данілюк, ты дзе? Чаму маўчыш, маёр, чаму не дакладваеш? Што там у вас адбываецца? Прыём! – сярдзіта надрываліся навушнікі.

– У Бернау, таварыш генерал, у Бернау, – адказаў кампалка і не пазнаў свайго голасу, такі ён быў стомлены і скрыпучы.

А неўзабаве з НП корпуса ўбачылі, што над сценамі горада-крэпасці, якія яшчэ гадзіну назад лічыліся непрыступнымі, у некалькіх месцах з'явіліся белыя флагі: гітлераўцы склалі зброю. Бернау быў наш.

Не ведаў тады Леанід Сямёнавіч, што пройдуць гады – і пра яго, пра гэты "яго" дзень напішуць у кнігах: "Камандзір самаходнага артылерыйскага палка маёр Л. С. Данілюк вызначыўся ў Берлінскай аперацыі. 18.04.45 г. па яго ініцыятыве полк атакаваў непрыяцеля ў г. Бернау. Камандзір прыняў на сябе артылерыйскі агонь ворага, на прабітым танку прарваўся на ўскраіну горада, выклікаў паніку ў радах праціўніка, чым садзейнічаў паспяховаму наступленню корпуса. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 31 мая 1945 года..."

Пахавалі Паўла Сікорскага і Ігара Альшэўскага, іншых загінуўшых байцоў палка. Пахавалі і пайшлі далей. Такі лёс салдацкі: няма калі і памянуць сябра-нябожчыка. А рана Данілюка на гэты раз аказалася лёгкай. Ён выслухаў даклады аб стане падраздзяленняў пасля бою, выбраў новы, сёмы па ліку экіпаж і павёў полк на Берлін, да перамогі. Яна ўжо была блізка.

...Амаль чатыры дзесяцігоддзі мінула з тае пары. Стаяў такі ж сонечны веснавы дзень, як тады.

За акном вагона неяк нечакана апынуўся вакзал. Хто чакаў на пероне, убачылі, як у тамбуры з'явіўся невысокі пажылы чалавек у форме савецкага падпалкоўніка. На грудзях афіцэра, над ордэнскімі калодкамі, ззяла Залатая Зорка Героя. Пасажыр крыху затрымаўся, усхваляваным позіркам абвёў натоўп і малайцавата сышоў уніз. Нехта падхапіў чамадан, адусюль пасыпаліся кветкі. Ад пачуцця адзіноты, якое ахапіла яго ў дарозе, не засталося і следу, бо Данілюк адразу ж апынуўся ў гушчыні людзей, якія чакалі яго, радаваліся цяпер разам з ім.

Было шмат розных і цікавых сустрэч. Але галоўнай для яго была адна. Яшчэ дома, збіраючыся, ён ведаў, што абавязкова прыйдзе сюды.

– Таварышы, тут мае аднапалчане загінулі. Пабываць бы на магіле...

Цяністы гарадскі парк. Алея вядзе да абеліска. Полымя Вечнага агню асвятляе граніт. У ганаровай варце застылі піянеры-тэльманаўцы. Доўга стаяў ветэран, нізка схіліўшы галаву. Людзі маўчалі. Ніхто са сведкаў гэтай хвалюючай сустрэчы не асмеліўся парушыць святую цішыню...

Гаспадарам былі зразумелыя пачуцці рускага госця. А яму ў гэтыя мінуты здавалася, што ўсе гады пасля вайны жыў толькі памяццю пра тых, каго пахаваў на яе дарогах. Што ён ніколі, ніколі ў жыцці ні на крок не адыходзіў ад гэтага месца, якое стала свяшчэнным для яго, а таксама для іх, сённяшніх пакаленняў, чыю Радзіму ён, вызваліў ад фашызму ў сорак пятым. Як даўно гэта было! Але як шчыміць сэрца! У ім памяць болем адгукаецца. Цяжка стрымаць гэты боль, цяжка. Памяць – самы вялікі на зямлі доўгажыхар. "Не забуду вас, хлопцы", – ціха, нібы самому сабе, вымавіў ветэран і адышоў.

Данілюка папярэдзілі: рыхтуйцеся да сюрпрызу. Таварышы, якія суправаджалі яго, загадкава ўсміхаліся. Машына пад'ехала да сучаснага светлага будынка.

– Школа?

– Школа, Леанід Сямёнавіч. Прычым лепшая ў горадзе, – адказала перакладчыца. – Праходзьце, калі ласка!

У двары роўнымі радамі выстраіліся святочна апранутыя вучні.

– Добры дзень, дзеці!

Ён уваходзіць у клас і пачынае ўрок? Не, гэта было даўно. Пасля Перамогі Данілюк вучыўся ў ваеннай акадэміі, служыў у арміі. Потым працаваў у Харкаве, Магілёве. Цяпер, хоць узрост падышоў адпачываць, ходзіць штодзень на работу. Ён – начальнік аховы на адным з заводаў Рагачова. А Леанід Сямёнавіч проста ўявіў, быццам зноў ён настаўнік, быццам не было перажытага.

– Гутэн Таг! – дружна адказваюць дзеці.

Пачаўся мітынг. Гізела Ярас, першы сакратар акруговага камітэта партыі, зачытвае афіцыйны ўрадавы дакумент. Перакладчыца яшчэ не паспявае закончыць, як школьны двор выбухнуў громам апладысментаў і з супрацьлеглай ад трыбуны сцяны ўпала белае атласнае пакрывала. "Школа імя Героя Савецкага Саюза Леаніда С. Данілюка", – прачытаў былы настаўнік з невялікай беларускай вёсачкі. Перахапіла горла.

Але гэта яшчэ было не ўсё. Яму паказалі манумент, які стаяў у глыбіні двара. На п'едэстале – танк са знаёмай лічбай "220" на вежы. Затуманіла вочы. Слова вымавіць цяжка. Але ён сказаў:

– Ведаеце, гэта была жорсткая вайна. Аднак мы ішлі ў смяротны бой супраць фашызму і ў той жа час верылі ў нямецкі народ. Так-так, у народ Тэльмана, Цэткін, у радзіму Гейнэ, Гётэ, яе будучыню. У сорак другім краіне было вельмі цяжка, але Масква выдавала кнігі з творамі вашых класікаў...

Маладая перакладчыца – яна вельмі любіла Гейнэ – забылася пра свае абавязкі і моўчкі стаяла побач. Шырока адкрытымі вачамі дзяўчына глядзела на падножжа п'едэстала, дзе на аксаміцістых пялёстках чырвоных руж, нібы слёзы, застылі кроплі расы...

– Леанід Сямёнавіч, пара ехаць у Берлін.

Адсюль да Берліна было ўсяго трынаццаць кіламетраў...

***З пісьма нямецкіх педагогаў і школьнікаў Л. С. Данілюку:***

*"Ваша знаходжанне ў Бернау з'явілася вялікай падзеяй для нашага горада. А прысваенне Вашага імя сярэдняй школе № 6 было кульмінацыйным пунктам, які назаўсёды застанецца ў памяці дзяўчынак і хлопчыкаў, педагагічнага калектыву..."*

**Дудко, В. Д. За трынаццаць кіламетраў да Перамогі / В. Д. Дудко // Самы галоўны ўрок : настаўнікі Беларусі — героі Вялікай Айчынай / складальнік А. Л. Уліцёнак. — Мінск, 1994. — С. 52—73.**